6. Павлова, С. А. Проблема коммуникации студентов в межличностном общении / С. А. Павлова, Н. Н. Уварова // Мир науки, культуры, образования. – 2018. – № 6(73). – 305-306 с.

7. Сегеда, А. С. Эффективность дискуссионной речи в межличностной коммуникации: специальность 10.02.19 "Теория языка": диссертация на соискание ученой степени кандидата филологических наук / А. С. Сегеда. – Волгоград, 2019. – 198 с.

8. Шарков, Ф.И. Социальная коммуникация: истоки и парадигмы : лекция / Ф. И. Шарков; Рос. акад. гос. службы при Президенте Рос. Федерации. - Москва : изд-во РАГС, 2005. - 25 с.

9. Характеристика студенческой молодежи как социальной группы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.google.com/url?sg=aovvaw2xzcm89pkvvfobsgfbltde – Дата доступа: 6.03.2023.

Маслакова В.И., магистрант
дневной формы обучения
Научный руководитель – Наркевич Н.И.,
кандидат искусствоведения, доцент

## ТЭАТРАЛІЗАЦЫЯ АБРАДА «ШЧАДРАВАННЕ» Ў ВЁСЦЫ ТОНЕЖ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНА

Народная тэатральная творчасць з’яўляецца адной з вышэйшых форм сінтэтычнага мастацтва, здольнага абагульніць і адлюстраваць розныя бакі жыцця, разнастайнасць народных традыцый і эстэтычных поглядаў, узровень духоўнай культуры. Гісторыя сведчыць, што найбольш жыццяздольнымі, сацыяльна і мастацка значным зяўляўся той тэатр, які фарміраваўся на народнай нацыянальнай беларускай аснове [4, с. 5].

Беларус па сваёй генетычнай прыродзе вельмі тэатральны чалавек, здольны пра падзеі і ўчынкі людзей не толькі маляўніча расказаць, а і вобразна

іх паказаць, разыграць, скарыстоўваючы багатую міміку, тэмперамент, імправізацыйны дар. Яшчэ і цяпер, у наш цывілізавана-рацыянальны час, калі тэхнічны прагрэс невіліруе нацыянальную самабытнасць, сцірае народныя традыцыі, можна сустрэць, асабліва ў вёсках, ды і ў гарадах таксама, нямала прыроджаных умельцаў, якія таленавіта могуць увасобіць і камічныя, і трагічныя сцэнкі.

Традыцыі не знікаюць, так у 2019 г. група студэнтаў разам з гуртом «Этнасуполка» і выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Т. А. Пладуновай здзейснілі экспедыцыю ў вёску Тонеж Лельчыцкага раёна, як раз падчас каляднага цыклу, дзе ўбачылі тэатралізаваны абрад «Шчадраванне». Менавіта яму адведзена ў каляндарнай абраднасці вескі найважнейшае месца. Абрад «Шчадраванне» уключае шэраг атрыбутыўных элементаў, суправаджаецца гульнямі, спевамі, танцамі і варажбой.

Кожны год напярэдадні Старога Новага года жыхары вескі Тонеж з вечара да глыбокай ночы выходзяць з хат і спяваюць «абходныя», велічальныя і жартоўныя песні гаспадарам, з розных бакоў даносяцца традыцыйныя воклічы: «Добры вечар вам, загадайце песню нам». У мясцовым абрадавым гурце шмат удзельнікаў-персанажаў – музыкант, дзед і баба, звяздар і механоша, мядзведзь і «буська», «цыганкі».

Галоўны персанаж – «каза», пантаміміка якой у абрадзе суправаджалася сюжэтна звязанай з ёй каляднай песняй: «О-го-го, каза», дзе ў гіпербалізаваных выявах малюецца карціна будучага ўраджая («дзе каза рогам – там жыта стогам, «дзе каза хвастом – там жыта кустом») лічылася асноўным сімвалам пладавітасці і жыццёвай энергіі. Песня суправаджалася танцам-пантамімай, цэнтральным момантам якога была «смерць» не што іншае, як заканчэнне аднаго цыкла жыцця, а яе сімвалічнае «ўваскрэсенне» – перанараджэнне – пачатак новага касмічнага цыкла і адраджэнне прыроды [3, с. 532].

О-го-го, коза, жы, о-го-го сера,
Не ходзі, коза, жы ў чыстае поле,
У чыстом у полі жы там жыто росце.
Дзе коза ходзіці, там жыто родзіць,
Дзе коза топ-топ(а) там жыта сем коп,
Дзе коза рогом(а), там жыта стогом.
О-го-го коза жы, о-го-го сера,
Не ходзі, коза, жы й у кругом села,
Й у кругом села жы гарные стралцы,
Радзяцца ідці жы козачку ўбіці,
Козачку ўбіці жы, шкурку (а)блупіці,
Шкурку (а)блупіці жы, шубку пошыці.

«Каза-ляпа» раней вельмі была распаўсюджана ў паселішчах Лельчыцкага раёна і на Тураўшчыне, але да нашых дзён засталася толькі ў тонежскіх калядоўшчыкаў і цяпер з’яўляецца эксклюзіўным экзэмплярам, сапраўднай візітоўкай каляднага Тонежа. Яе водзіць за сабою «дзед – продак». Тонежская «каза» зроблена з невялікага бервяня, з дапамогай тонкай вяроўкі ў яе раскрываецца і зачыняецца пашча. Называюць яе «ляпай» таму, што казіныя сківіцы рухаюцца і ляпаюць адна аб адну.

Галоўны сярод антрапаморфных персанажаў гэта дзед (старац), які суправаджаў казу або хадзіў у пары з бабай. Гэты вобраз вельмі характэрны для маскіравання ў сістэме традыцыйнай культуры беларусаў, як і ў іншых народаў, бо прадстаўляе своеасаблівы ніз, дно сацыяльнай будовы грамадства, дэманструе, сімвалізуе сабой супрацьпастаўленне сацыяльна высокаму, а таксама маладому. На думку даследчыкаў, маскіраваныя персанажы Дзед і Баба прадстаўлялі ў час тэатралізаваных паказаў памёршых продкаў. Яны апрануты ў саматканае адзенне, што захоўваецца ў скрынях як памяць пра талент і працу рук прашчураў, але на спіне Дзеда яшчэ рабілі горб. Дзед

звычайна вядзе Казу, а Баба нясе сяверньку або торбу, у якую збірае каляду [3, с. 27].

На ролю Мядзведзя выбіралі звычайна дужых, вынослівых хлопцаў, якія б маглі хадзіць у шматкілаграмовым карнавальным касцюме ўсю ноч. Часта да спіны мядзведзя прымацоўвалі дошку, каб павадыр мог мацней стукаць па ёй. Хлопца прыбіралі ў два чорныя вывернутыя кажухі. Вобраз мядзведзя вядомы ў якасці захавальніка жывёлы, які надзяляецца антрапаморфнымі рысамі, сімвалам урадлівасці, здароўя і сілы [3, с. 24].

Персанажы Цыган і Цыганка былі самымі распаўсюджанымі на тэрыторыі Беларусі ў час разнастайных святаў і абрадаў. Карнавальны вобраз цыгана з'явіўся ў традыцыйнай абраднасці беларусаў пасля таго, як цыгане прыйшлі на землі Беларусі ў XV ст. праз Польшчу і Германію, а ў канцы XVI – пачатку XVII ст. з Венгрыі. Персанаж Цыгана апраналі пераважна ў дзіравыя лахманы, абмазвалі твар сажай, абавязковым яго атрыбутам – этнічным – была пуга. У вандроўнікаў пуга сапраўды мела сакральнае значэнне як крыніца гаспадпрчага дабрабыту. Неахайныя маскі цыганоў, бяспрэчна, моцна набліжаюць гэтыя вобразы да нячысцікаў. Паводзіны маскіраваных цыганоў таксама супярэчаць нормам і маралі сялянскага жыцця (крадзеж, блюзнерства, неземляробчыя заняткі). Такім чынам, цыганскі нацыянальны каларыт у гэтых персанажах з'яўляецца толькі фармальнай часткай, іх абалонкай, сутнасць жа іх – у сувязі з нячыстай сілай [3, с. 29].

З арнітаморфных персанажаў удзельнікам абраду з'яўляецца бусел (буська). Бусла называюць святой птушкай, лічаць веснікам дабра разам з ластаўкай. Птушкі звязаны з выраем – разам з імі душы памерлых адлятаюць на той свет і вяртаюцца вясной, дапамагаючы нашчадкам у клопатах пра ўраджай [3, с. 25].

Абход дамоў па словах жыхароў вёсцы накіраваны на абарону сельскай абшчыны ад розных варожных сіл, на дасягненне дабрабыту і паспяховае вырашэнне сямейных клопатаў – жаніцьба сыноў, замужжа дачок. Наш гурт

таксама вырашыў зрабіць абход хат разам з таняжанамі. У кожны двор мы заходзілі са шчадроўкай:

Шчодры вечор, добры вечор,
Усім людзям на ўвесь вечор!
Ой, ці дома пан гаспадар?
Ой, я бачу, што ён дома,
На ём шуба сабалёва.
На ём світа ўаўком шыта.
Вынесь, пане, піражэчка,
Хоць малого ды смашного.

У кожнай хаце гучалі шчадроўкі сыну, дачцэ і самім гаспадарам з добразычлівымі пажаданнямі. А таксама не абыходзіліся без гульні «Каза».

Для носьбітаў традыцыі зараз галоўнай мэтай абраду з’яўляецца павіншаваць жыхароў вёсцы, пажадаць шчасця, дабрабыту. Сёння абрад Каляд жыве ў народзе як вясёлы зімовы карнавал, дзе можна ўбачыць сапраўдную прыгажосць народных звычаяў. Там кожны можа паказаць сябе, сваё майстэрства ў слове, гульнях і спевах. Пасля абходу хат надыходзіць вялікае застолле, да якога звычайна далучаюцца слухачы і суседзі – аднавяскоўцы. У побыце сучаснай палескай вескі абрад каляды – любімая тэатралізованая зімовая гульня, свайго роду сельскі карнавал, які захапляе як моладзь, так і людзей сталага ўзросту.

Дагэтуль вёска Тонеж і носьбіты калектыву «Таняжанка» прываблiваюць турыстаў і аматраў фальклору з усёй Беларусі.

У 2014 г. пры ўдзеле народнага фальклорнага калектыву «Таняжанка» знята дакументальная стужка-абрад «Чырачка», або «Як у Тонежы вясну гукалі» (рэжысёр М. Курачова, студыя «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм»). Трэба адзначыць, што гурт «Таняжанка» з'яўляецца захавальнікам элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Абрад гукання вясны “Чырачка”» [1].

Тонеж – радзіма карыфееў палескага вакальнага стылю, «зорак»

айчынай этнафоніі С. Дубейкі і яго жонкі М. Дубейкі, Г. Венгуры, дзякуючы якім спеўны стыль перадаецца дагэтуль і зараз адэкватна гучыць у малодшага пакалення. Гэта таксама «любімая» спеўная вёска этнамузыколага З. Мажэйкі, дзякуючы выданням якой, асабліва фільмам і аўдыёзапісам, мы, можам пераймаць песні і абрадавыя традыцыі. З гэтых кінастужак магчыма адчуць магію і сакавітасць Палескіх Каляд 1960–1970 гадоў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Жывая спадчына Беларусі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://livingheritage.by – дата доступу: 28.01.2023.
2. Кляшчук, А. Карагод беларускіх абрадаў [Выяўленчы матэрыял] = Circle dance of belarusian rites / А. Кляшчук. – Мінск : Беларусь, 2015. – 383 с.
3. Кухаронак, Т. І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак ; рэд. савет: Я. В. Малашэвіч [і інш.]. – Мінск : Ураджай, 2001.– 239 с.
4. Музыкальный театр Белоруссии: дооктябрьский период / Г. И. Барышев [и др.]; ред. Г. Г. Кулешова. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 382 с.

Маспанов Н.С., студент 220н группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Чурко Ю.М,
доктор искусствоведения, профессор

## ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ БЕЛОРУССКОГО ФОЛЬКЛОРА В ТВОРЧЕСКОЙ И ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПРОФЕССОРА КАФЕДРЫ ХОРЕОГРАФИИ БГУКИ ГУТКОВСКОЙ СВЕТЛАНЫ ВЯЧЕСЛАВОВНЫ

С момента обучения на кафедре хореографии Минского института культуры, выезжая во время прохождения фольклорной практики в